Падтрымай "Вясну" на PATREON

Тры гады "хатняй хіміі" — за знаходжанне на праспекце і парушэнне працы "Мінсктранса"

16.06.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, грамадства, ціск, свабода мірных сходаў



Судовая зала. Ілюстрацыйнае фота spring96.org

Да трох гадоў "хатняй хіміі" асудзілі Аляксандра Савосціна, якога прызналі вінаватым паводле ч.1 арт. 342 Крымінальнага кодэкса. Справу разгледзела суддзя Алена Капцэвіч, бок абвінавачання падтрымала пракурор Кунцэвіч. Перад абвяшчэннем прысуда пракурора змянілі. Савосцін вызвалены ў залі суда. Пазоў Мінсктранса на 21 тысячу 831 рубель 69 капеек вылучаны ў асобную грамадзянскую вытворчасць.

Мужчыну прызналі вінаватым у тым, што 11 жніўня ён знаходзіўся на праспекце Пераможцаў, ведаючы, што мерапрыемства несанкцыянаванае. Сваімі дзеяннямі ён парушаў грамадскі парадак, не падпарадкаваўся супрацоўнікам, парушыў працу "Мінсктранса".

Што кажа абвінавачаны?

Аляксандр Савосцін **цалкам прызнаў віну**, пазоў Мінсктранса — часткова. **Ён адмовіўся даваць паказанні на судзе.**

Падчас папярэдняга следства ён распавёў, што на прэзідэнцкіх выбарах 2020 года ён прагаласаваў за Святлану Ціханоўскую і быў нязгодны з вынікамі, згодна з якімі перамог Аляксандр Лукашэнка. Таму выйшаў на масавае мерапрыемства. У натоўпе крычалі "Жыве Беларусь" і "Міліцыя з народам"; з боку супрацоўнікаў міліцыі і яго самога не было гвалту, ён не атрымліваў грошы за ўдзел у мерапрыемстве. Таксама Кунцэвіч адзначыў, што не блакаваў рух: дарога ўжо была перакрытая.

Калі супрацоўнікі міліцыі пайшлі ў атаку, ён стаў у счэпку: навошта, зараз не ведае. На фотаматэрыялах, прадстаўленных ГУБАЗіКам, пазнаў сябе.

Што кажуць сведкі?

У справе няма сведкаў, акрамя сведак ад МУС: яны на паседжанне не з'явіліся праз "*занятасць у сувязі з палітычнай сітуацыяй у краіне*". Быў зачытаны пратакол допыту сведкі Міхневіча, кіроўцы ў аэрапорце: ён не бачыў, чым займаўся Савосцін у той дзень.

Сярод матэрыялаў справы — фота счэпкі, у якой абвінавачаны пазнаў сябе, пратаколы вобшукаў, сярод вынутых рэчаў — БЧБ-сцяг, пісталет для трэніровак, зарадка, ноўтбук.

Што казалі ў спрэчках?

Бок абвінавачання падкрэсліў, што Савосцін прызнаў віну, і папрасіў улічыць станоўчыя характарыстыкі абвінавачанага і прызначыць яму пакаранне ў выглядзе **абмежавання волі тэрмінам на тры гады без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу: "хатняй хіміі".** Меру стрымання змяніць на падпіску аб належных паводзінах.

Абаронца падкрэсліла, што артыкул, паводле якога абвінавачваецца Савосцін, гучыць досыць сурова і жудасна. Згодна з ім, паказваецца актыўны ўдзел у мерапрыемстве, аднак, мяркуючы па матэрыялах справы, актыўных дзеянняў не было заўважана. Таму, зыходзячы са станоўчых дакументаў, прасіла б прызначыць мінімальны тэрмін: праз немагчымасць Савосціна выплаціць штраф — арышт, абмежаваны адбытым тэрмінам. Паколькі тэрмін утрымання пад вартай ужо перавышае палову запрошанага пракурорам і ёсць шмат змякчальных абставінаў, адвакат прасіла прызначыць **пакаранне ў выглядзе шасці месяцаў "хатняй хіміі".** Пазоў яна папрасіла пакінуць без разгляду, каб разбірацца з ім у грамадзянскім парадку.

Твитнуть



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брасце і Віцебску пасля рэйда па сацсетках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY